ISSN 3072-3140, eISSN 3072-4376
Copyright © by Alena Kalechyts, 2025
Creative Commons Attribution-NonComercial 4.0
(CC BY-NC 4.0)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc/4.0/
DOI: https://doi.org/10.31338/uw.ijbg.2025.2

Алена Калечыц ♦ Alena Kalechyts

Універсітэт імя Канстанціна Філосафа ў Нітры, Славакія
Constantine the Philosopher University in Nitra, Slovakia
ORCID: https://orcid.org/ 0000-0002-5738-7168
e-mail: kalechytsalena@gmail.com

Вербальныя эквіваленты жэстаў і мімікі ў маўленчым этыкеце беларусаў: лінгвапрагматычны і дыдактычны аспекты (на прыкладзе працы з тэкстамі)*

Verbal Equivalents of Gestures and Facial Expressions in Belarusian Speech Etiquette: Linguopragmatic and Pedagogical Aspects of Working with Texts

Abstract: In both formal and informal communication, interlocutors use various gestures and facial expressions alongside conventional verbal etiquette formulas. These nonverbal cues frequently help interlocutors interpret a message correctly, understand a person's mood and psychological state, and thus anticipate whether the speaker's communicative intentions are likely to be realised. As artificial intelligence develops—helping us quickly find and process information but not teaching us how to express our emotions and feelings—the conscious use of nonverbal means in intercultural communication is becoming increasingly relevant. These skills can also be practised in foreign language classes. They can enhance students' emotional intelligence, help them retain new knowledge, and overcome psychological and language barriers in communication. The main aim of this study is therefore to select linguistic expressions describing gestures and facial expressions, together with terms for emotions, and to develop activities for learning and using them in speech and writing. The main teaching resources are texts presented in two traditional forms, as well as audiovisual versions. The article focuses on two situations in speech etiquette: greetings and leave-taking. To achieve this aim, it proposes text-based activities organized into three stages: pre-reading (preparatory), while-reading, and post-reading, assuming a B1 level of language proficiency. The study's theoretical basis is a dynamic approach to text and discourse, which treats them as complex communicative phenomena encompassing verbal and nonverbal information and taking into account the speaker, the addressee, and their cognitive states. Text is also examined from a linguopragmatic perspective, with a focus on its effect on the addressee—in this case, the learner—to facilitate the acquisition of knowledge and its application in communicative behaviour.

Keywords: intercultural communication, nonverbal communication, emotions, text, linguopragmatic approach.

* Дадзеная праца напісана ў межах рэалізацыі праекту VEGA 1/0456/25 "Антрапацэнтрычная парадыгма прагматыкі тэксту як дыскурсу" (01/2025 – 12/2028).

Вербальныя эквіваленты жэстаў і мімікі ў маўленчым этыкеце…

Рэзюмэ: Падчас любой камунікацыі (у сітуацыі афіцыйных або нефармальных зносін) суразмоўцы, акрамя традыцыйных формул маўленчага этыкету, выкарыстоўваюць разнастайныя жэсты і міміку, якія звычайна суправаджаюць пэўнае выказванне. Менавіта невербальныя сродкі даволі часта дапамагаюць суразмоўцам правільна інтэрпрэтаваць змест паведамлення, разумець настрой і той псіхалагічны стан чалавека, у якім ён знаходзіцца, а значыць загадзя ацэньваць верагоднасць паспяховасці рэалізацыі запланаваных інтэнцый адрасанта. У сувязі з развіццём штучнага інтэлекту, які кожнаму з нас дапамагае хутка знайсці і апрацаваць інфармацыю, але не вучыць выражаць свае эмоцыі і пачуцці, становіцца актуальным зварот да свядомага выкарыстання ў міжкультурнай камунікацыі менавіта невербальных сродкаў зносін. У гэтым можна практыкавацца на занятках і па замежнай мове. Атрыманыя ўменні і навыкі палепшаць эмацыйны інтэлект студэнтаў, паскораць працэс запамінання новых ведаў, паспрыяюць пераадоленню псіхалагічнага і моўнага бар'ераў у зносінах. Так, галоўная задача дадзенай працы бачыцца як у адборы названых моўных адзінак, так і назваў эмоцый, а таксама арганізацыі работы па іх вывучэнні і ўжыванні ў вусным і пісьмовым маўленні. Асноўным сродкам навучання ўяўляюцца розныя тэксты, прадстаўленыя ў дзвюх традыцыйных формах (і, натуральна, аўдыявізуальных варыянтах). У артыкуле сканцэнтроўваецца ўвага толькі на такіх сітуацыях маўленчага этыкету, як прывітанне і развітанне. З мэтай рэалізацыі вышэйназванай задачы прапаноўваюцца заданні, арыентаваныя на працу з тэкстамі, якая традыцыйна размяркоўваецца на тры этапы – перадтэкставы (падрыхтоўчы), прытэкставы і паслятэкставы (прадугледжаны ўзровень валодання мовай B1). Тэарэтычнай базай працы з'яўляецца дынамічны падыход да паняццяў *тэкст* і *дыскурс*, пры якім яны разглядаюцца як складаная камунікатыўная з'ява з вербальнай і невербальнай інфармацыяй, звернутая да суб'екта маўлення і адрасата і іх кагнітыўнага стану. Акрамя таго, тэкст разглядаецца з лінгвапрагматычнага аспекту, які накіраваны ўздзейнічаць на адрасата, г. зн. на студэнта, з мэтай лепшага засваення прапанаваных ведаў і іх аплікацыі ў сваіх камунікатыўных паводзінах.

Ключавыя словы: міжкультурная камунікацыя, невербальныя сродкі, эмоцыі, тэкст, лінгвапрагматычны падыход.

Як вядома, галоўным у працэсе міжкультурнага навучання замежнай мове, у тым ліку беларускай, з'яўляецца прынцып камунікатыўнасці, які падразумявае навучанне як працэс зносін [Валочка 2020: 8], падчас якога студэнты развіваюць свае маўленчыя і, у тым ліку, камунікатыўныя здольнасці. Камунікатыўная дзейнасць падразумявае авалодванне не толькі лінгвістычнымі навыкамі, але і камунікатыўнымі стратэгіямі, якія забяспечваюць вырашэнне камунікатыўных задач і пабудову, успрыманне і разуменне разнастайных тэкстаў. Гэтыя здольнасці ў лінгвадыдактычнай, або глотадыдактычнай (гл., напрыклад, [Калета 2019: 14–15]), літаратуры вызначаюцца як лінгвапрагматычныя кампетэнцыі [Коряковцева 2021: 38]. Важнае значэнне пры гэтым мае дзейнасны падыход у выкладанні беларускай мовы як замежнай (БМЗ) [Валочка 2020: 6]. Ён, як правіла, рэалізуецца праз працу з тэкстам як сродкам навучання, што, па меркаванні Міхаіла Бахціна, з'яўляецца фундаментам, на якім ствараюцца і трымаюцца розныя галіны ведаў [Бахтин 1986: 297]. Нездарма маўленчая (і разам з тым камунікатыўная) дзейнасць многімі даследчыкамі трактуецца як тэкставая. Яна пакладзена ў аснову тэкстацэнтрычных канцэпцый навучання [Сямешка 2018: 67]. Пры гэтым тэкст разглядаецца як адзінка камунікацыі і прадукт маўленчых зносін [Вержбицкая, Алексина 2009: 15; Коряковцева 2021: 34]. Ён з'яўляецца складаным аб'ектам, арыентаваным на чалавека і яго маўленчую і немаўленчую дзейнасць, у якой адлюстраваны асаблівасці мыслення і свядомасці індывіда. Такім чынам, пры інтэрпрэтацыі аўтарскай

задумы тэксту мэтазгодна ўлічваць “адзінства двух бакоў – знешне выканаўчага і ўнутранага, знешне неназіральнага” [Вержбицкая, Алексина 2009: 15; пераклад – А. К.].

Так, абодва аспекты, названыя вышэй, відавочныя якраз падчас вуснай камунікацыі, калі, акрамя вербальных сродкаў, адрасант ужывае міміку і жэсты, а таксама адпаведную інтэнцыям і адносінам да рэцыпіента інтанацыю. У пісьмовых тэкстах з прагматычнымі мэтамі аўтар нярэдка таксама звяртаецца да апісання невербальных знакаў, выкарыстаных гаворачымі асобамі, а ў медыятэкстах, якія, як правіла, з’яўляюцца палікодавымі, вербальны кампанент можа суправаджацца аўдыявізуальнымі матэрыяламі. Яны, бясспрэчна, дапамагаюць чытачу разгадаць сапраўдны намер адрасанта.

Такім чынам, паўстае неабходнасць вучыць студэнтаў разумець значэнне невербальных сродкаў камунікацыі, валодаць лексікай, якая іх называе, і, безумоўна, правільна ўсё выкарыстоўваць у час размовы як з носьбітамі мовы, так і прадстаўнікамі іншых культур.

Гэтая задача, думаецца, адпавядае асноўным перспектывам, сфармуляваным у новай праграме навучання БМЗ: “<...> распрацоўка сучаснай вучэбна-метадычнай базы па беларускай мове як замежнай <...> паспрыяе аптымізацыі адукацыйнага працэсу і пашырэнню беларускай мовы і культуры ў еўрапейскай акадэмічнай і культурнай прасторы” [Сямешка 2018: 66]. Адпаведна, як ужо было адзначана, з самага пачатку важным з’яўляецца знаёмства студэнтаў з лексікай, а таксама фразеалагічнымі адзінкамі, якія служаць для іменавання жэстаў і мімікі. Гэтая праца можа быць рэалізавана на перадтэкставым этапе, накіраваным на падрыхтоўку да знаёмства з выбранымі тэкстамі на занятках. Іх змест, натуральна, павінен быць звязаны з ужываннем беларусамі невербальных сродкаў камунікацыі ў разнастайных сітуацыях зносін у параўнанні з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей. Паколькі нашыя міміка і жэсты звычайна адпавядаюць пачуццям і эмоцыям, звязаным з адносінамі да тых асобаў, да каго мы звяртаемся з маўленнем, напачатку бачыцца патрэбным азнаямленне студэнтаў з назвамі базавых эмоцый і пачуццяў.

Прэзентацыя новай лексікі можа адбывацца з дапамогай нагляднага метаду, у прыватнасці праз дэманстрацыю фотаздымкаў (карцінак) ці кароткіх відэаролікаў, у якіх адлюстраваны адпаведныя міміка і жэсты. Дадзены наглядны матэрыял загадзя падпісваецца выкладчыкам, які суправаджае выбраныя ілюстрацыі заданнямі: напрыклад, зымітаваць убачанае на экране і паўтарыць уголас назву роліка (здзіўленне, шаленства, злосць, жах, страх, сум/смутак, агіда, радасць, цікаўнасць, разгубленасць, гора/роспач, крыўда, нуда, віна, раздражненне).

Затым прапаноўваецца заданне на пераклад з беларускай мовы на родную назваў невербальных знакаў, каб пераканацца, што студэнты разумеюць новую лексіку і суадносяць яе са словамі, вядомымі з дзяцінства. Пры гэтым студэнты паўтораць найменні цела чалавека.

Перакладзіце словы на родную мову. Час выканання задання – 2 хвіліны.

Здзіўленне	– _____	Агіда	– _____
Сум	– _____	Крыўда	– _____
Гора	– _____	Віна	– _____
Шаленства	– _____	Нуда	– _____
Страх	– _____	Разгубленасць	– _____
Жах	– _____	Цікаўнасць	– _____
Злосць	– _____	Радасць	– _____

Вербальныя эквіваленты жэстаў і мімікі ў маўленчым этыкеце…

Плечы – _____
Рукі – _____
Спіна – _____
Бровы – _____
Вейкі – _____
Вусны – _____

З мэтай замацавання новай лексікі можна папрасіць выканаць яшчэ адно практыкаванне – падпісаць фотаздымкі (карцінкі) назвамі эмоцый/пачуццяў, якія на іх адлюстраваны. Акрамя таго, як здаецца, карысна вучыць суадносіць невербальныя знакі з іх вербальным апісаннем. Таму наступнае заданне варта накіраваць менавіта на рэалізацыю гэтай задачы.

Вы праглядаеце апісанне жэстаў і мімікі (Спіс 1 або Спіс 2). Аднакурснік/-ца іх паказвае. Памяняйцеся ролямі.

Спіс 1

1	Агіда	– зморшчыць твар
2	Здзіўленне	– шырока расплюшчыць вочы і моцна падняць бровы
3	Разгубленасць	– пакруціць галавой з боку ў бок, нібы кагосьці/нешта шукаеш
4	Страх	– плечы ўзняць так, нібы хочаш у іх уцягнуць галаву, вельмі шырока расплюшчыць вочы
5	Цікаўнасць	– злёгку падацца целам да суразмоўцы, вусны крыху прыадкрыць, бровы прыўзняць
6	Шаленства	– рукі сціснуць у кулакі (апушчаныя або сагнутыя ў локцях, узнятыя пад любым вуглом), вусны пагрозліва напалову адкрыць, вочы шырока расплюшчыць
7	Віна	– галаву апусціць і злёгку павярнуць убок

Спіс 2

1	Сум	– схіліць галаву, выраз твару зрабіць сур'ёзным
2	Радасць	– узняць бровы, злёгку ўсміхацца сціснутымі вуснамі
3	Жах	– схапіцца рукамі за галаву, вусны напаўраскрыць, бровы звесці разам, вочы шырока расплюшчыць
4	Крыўда	– апусціць галаву, позірк вачэй сканцэнтраваць уніз, вусны злёгку сціснуць, напружыць цэнтр вуснаў
5	Нуда	– абаперціся галавой на руку
6	Гора	– схапіцца за галаву
7	Злосць	– вусны моцна сціснуць, напружанне перанесці ў цэнтр вуснаў, погляд зрабіць злосным, бровы апусціць і звесці разам

Такім чынам, студэнты не толькі пазнаёмяцца з новай лексікай, а апрабуюць яе выкарыстанне ў сваёй камунікатыўнай дзейнасці. Далей мэтазгодна перайсці да прытэкставага этапу: студэнтам можна прапанаваць заданне прачытаць тэксты (самім сабе) з карыснай інфармацыяй, якая, магчыма, спатрэбіцца ў камунікатыўных сітуацыях міжкультурных зносін прывітання або развітання. Для выканання задання навучэнцаў варта раздзяліць на пары (або тройкі), кожнаму ставячы ўмову прачытаць усе

тэксты, а потым змест аднаго з іх сцісла пераказаць аднагрупніку. Адпаведна іншаму студэнту патрэбна будзе перадаць змест другога тэксту і г. д.

Цікава, што ...

I. …падчас прывітання на адлегласці беларусы звычайна махаюць адзін аднаму рукой з боку ў бок. А ў Паўночнай Амерыцы, напрыклад, такі жэст выкарыстоўваецца пры развітанні, а вось жыхары Цэнтральнай Амерыкі або Афрыкі такім спосабам спыняюць машыну ці падклікаюць да сябе кагосьці. Калі мы гаворым пра сябе і паказваем пры гэтым на свае грудзі, японцам здаецца гэты рух дзіўным, бо ў такім выпадку яны стараюцца дакранацца да свайго носа. А вось паціскаць адзін аднаму рукі пры сустрэчы і прывітанні стаў папулярным ва ўсім свеце адносна нядаўна – толькі ў XX стагоддзі. Аднак кітайцы, напрыклад, дагэтуль стараюцца пазбягаць цялесных кантактаў з незнаёмымі людзьмі.

II. ...поціск рукі – гэта ўмоўна мужчынскі жэст. Раней у беларусаў было не прынята, каб жанчыны паміж сабой або з мужчынамі абменьваліся поціскамі рук. Аднак пры дзелавых стасунках гэтая традыцыя парушаецца ўвесь час: бізнесмен можа першым падаць руку бізнесвумен для поціску і наадварот. У іншых сітуацыях зносін жанчыны не часта паціскаюць адна адной рукі.

III. ...замест слоў ухвалення, а таксама ў сітуацыях развітання і прывітання ў нефармальных зносінах (сяброўскіх і інтымных) беларусаў часта сустракаецца пацалунак. Гэта адна з формаў ветлівасці, якая адлюстроўвае сімпатыю і блізкія адносіны паміж людзьмі. Паміж малазнаёмымі людзьмі пацалункі ў беларусаў непрынятыя. Аднак у эпоху сацыялізму яны дазваляліся і нават былі абавязковымі на міжнародным узроўні, як частка прывітальнай цырымоніі гасцей.

На сучасным этапе ў розных відах зносін, як правіла, выкарыстоўваюцца тры тыпы пацалункаў – у шчаку, у вусны і рытуальныя (царкоўныя). Важнай адметнасцю ў культуры розных народаў з'яўляецца колькасць узаемных пацалункаў падчас прывітання і развітання. Так, у ЗША цалуюцца адзін раз, у Славакіі і некаторых іншых еўрапейскіх краінах – два разы, а ў Беларусі, Расіі і, напрыклад, Баварыі – тройчы. Невыпадкова, напэўна, слова *пацалунак* абазначае "заставацца цэлым, здаровым" [Makarowska і інш. (рэд.) (у друку)].

На выкананне падобнага задання, відаць, спатрэбіцца не менш як 15–20 хвілін вучэбнага часу. У канцы рэкамендуецца задаць, напрыклад, такое пытанне: якая інфармацыя аказалася новай для студэнтаў або што для іх было найбольш цікавым / карысным?

З мэтай замацавання і кантролю якасці вышэйатрыманых ведаў варта прапанаваць наступнае практыкаванне, адпаведнае ўжо паслятэкставаму этапу:

Выберыце любую фразу, якую беларусы ўжываюць пры сустрэчы ці развітанні. Вымавіце яе бязгучна тры разы з рознымі эмоцыямі/пачуццямі. Аднакурснік/-ца павінен/-на адгадаць гэтую фразу, а таксама эмоцыі і пачуцці, з якімі яна была вымаўлена. Памяняйцеся ролямі.

Эмоцыі, пачуцці: здзіўленне, сум, злосць, страх, нуда, жах, радасць, агіда, цікаўнасць.

РАЗВІТАННЕ

- Да пабачэння.
- Ну, бывайце!
- Заставай(-це)ся здароў(-вы).
- Будзем на сувязі.
- Дабранач!
- Шчасліва заставацца!
- Дазвольце адкланяцца.
- Пакуль!
- Пабачымся! Пачуемся!
- Усяго добрага!
- Усяго найлепшага!
- Салодкіх сноў!

ПРЫВІТАННЕ

- Рады / рада вас бачыць.
- Якія людзі!
- Вось гэта сустрэча!
- Як жывяце?
- Як маецеся?
- Каго я бачу!
- Дабрыдзень!
- Здароў!

ПРЫВІТАННЕ Ў ЛЮБЫ ЧАС

- Добры вечар!
- Добры дзень!
- Вітаю вас!

РАЗВІТАННЕ І ПРЫВІТАННЕ

- Добрай ночы!
- Маё шанаванне!
- Хлеб ды соль!

Напрыканцы заняткаў можна даць студэнтам яшчэ творчае заданне пісьмовага характару: прачытаць жартоўныя тэксты і змяніць у іх, напрыклад, апошнюю фразу, а пасля выбраць найлепшую па меркаваннях усіх студэнтаў:

***
– Мы развітваемся!
– Мог бы неяк і прыгажэй сказаць.
– Мне надакучыла тануць у тваіх вачах.

***
– Пажадай мне чаго-небудзь на ноч.
– Смачна есці.

Такім чынам, прапанаваны комплекс заданняў, хутчэй за ўсё, дапаможа студэнтам быць больш падрыхтаванымі да зносін, лепш арыентавацца ў разнастайных камунікатыўных сітуацыях, а значыць паспрыяе паспяховасці ў міжкультурнай камунікацыі. Акрамя таго, такі падыход да правядзення заняткаў дапаможа фарміраванню глыбокай міжкультурнай кампетэнцыі студэнтаў, пасадзейнічае пазбяганню культурных шокаў і непаразумення ў зносінах, а таксама паскорыць працэс вывучэння замежнай мовы за кошт падключэння памяці цела і эмоцый.

Неабходна падкрэсліць, што прыведзеныя ў прыклад заданні былі ўзяты з часткі рукапісу шматмоўнага дапаможніка "Штодзённыя жэсты. Агляд невербальнай міжкультурнай камунікацыі" аўтаркі гэтага артыкула [Makarowska і інш. (рэд.) (у друку)]. Дапаможнік ствараецца сіламі міжнароднага аўтарскага калектыву пад кіраўніцтвам дацэнта Вольгі Макароўскай, якая працуе ва Універсітэце імя Адама Міцкевіча ў Познані (Польшча). Асноўнай мэтай дапаможніка з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў міжкультурнай камунікатыўнай кампетэнцыі з асаблівым ухілам у невербальны складнік зносін. Вучэбны матэрыял, як падкрэслена ў прадмове, прызначаны развіваць навыкі адэкватнага ўспрыняцця і інтэрпрэтацыі невербальных паводзінаў прадстаўнікоў розных культур, а таксама свядома і правільна выкарыстоўваць міміку і жэсты падчас разнастайных штодзённых сітуацый з прадстаўнікамі іншых этнічных супольнасцей. Дапаможнік раздзелены на чатыры часткі – польскую, украінскую, беларускую і рускую, кожная з якіх складаецца з чатырох падраздзелаў (тэм), а таксама ключоў (адказаў) да практыкаванняў і блоку рэлаксацыйных гульняў. У кожным падраздзеле вылучаюцца наступныя структурныя кампаненты: размінка (заданні на імітаванне і адрозненне эмоцый/пачуццяў), уласна практыкаванні (яны ў асноўным інтэрактыўнага характару), карысна ведаць (тэксты з цікавымі фактамі аб невербальных паводзінах чалавека ці ўніверсальных жэстах), разняволься (з разнастайнымі тэкстамі жартоўнага зместу). Разам з тым у дадатку (ён на чэшскай мове) прыводзяцца прыклады заданняў альтэрнатыўнага характару адносна асноўнай часткі дапаможніка. Ключавым аргументам увядзення названага матэрыялу з'яўляецца адлюстраванне крэатыўнага падыходу да прапанаваных відаў заданняў і паказу магчымасці іх мадыфікацыі ў залежнасці ад індывідуальных здольнасцей выкладчыкаў і зацікаўленасці студэнтаў.

References

Бахтин Михаил. 1986. *Эстетика словесного творчества*. Москва [Baxtin Mixail. 1986. *Èstetika slovesnogo tvorčestva*. Moskva].

Валочка Ганна. 2020. *Кампаненты сістэмы навучання беларускай мове як замежнай*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 4: 5–12 [Valočka Hanna. 2020. *Kampanienty sistemy navučannia bielaruskaj movie jak zamiežnaj*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 4: 5–12].

Вержбицкая Татьяна, Алексина Лидия. 2009. *Психолингвистика: учебное пособие*. Минск [Veržbickaja Tat'jana, Aleksina Lidija. 2009. *Psixolingvistika: učebnoe posobie*. Minsk].

Калета Радаслаў. 2019. *Беларусістычная глотадыдактыка як паўнавартасная галіна навукі*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 3: 7–18 [Kaleta Radaslaŭ. 2019. *Belarusistyčnaja hlotadydaktyka jak paŭnavartasnaja*

halina navuki. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 3: 7–18].

Коряковцева Наталия. 2021. *Актуальные проблемы лингводидактики: курс лекций*. Москва [Korjakovceva Natalija. 2021. *Aktual'nye problemy lingvodidaktiki: kurs lekcij*. Moskva].

Сямешка Лідзія. 2018. *Праграма "Беларуская мова як замежная" ў кантэксце сучаснай культурна-філасофскай інтэрпрэтацыі мовы і кампетэнтнаснай адукацыйнай парадыгмы*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 2: 66–76 [Siamieška Lidzija. 2018. *Prahrama "Bielaruskaja mova jak zamiežnaja" ŭ kantekscie sučasnaj kuĺturna-filasofskaj interpretacyi movy i kampietentnasnaj adukacyjnaj paradyhmy*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 2: 66–76].

Makarowska Olga, Kuca Zoja, Kalechyts Alena, Terno-Jeleńska Weronika, Byčkov Jiří, Narloch Andrzej (red.). W druku. *Gesty na co dzień. Repetytorium z niewerbalnej komunikacji międzykulturowej*.